# Сяброўская сустрэча

Першая сустрэча жаночых і мужчынскіх каманд спортклубаў БДУ і Варшаўскага політэхнічнага інстытута адбылася ў Варшаве ў маі гэтага года і была прысвечана 25-годдзю ПНР. З адказным візітам варшаўскія баскетбалісты прыязджалі да нас у чэрвені.

Нядаўна госцем нашага універсітэта была жаночая баскетбольная каманда польскіх студэнтак. Дзве сустрэчы, якія адбыліся ва універсітэцкай спартыўнай зале, прайшлі ў цёплых сяброўскіх абставінах і ў цікавай спартыўнай барацьбе. Вялікай напружанасці гульня дасягнула ў другой сустрэчы.

На табліцы вынікаў каманд раз-пораз мяняліся лічбы: 58:59, 62:61, 69:69 — і так амаль да канца матча.

Варшаўскі політэхнічны інстытут можа ганарыцца сваімі выхаванцамі. Іх гульня была ў абароне стойкай, а ў наступленні напорыстай і дружнай. Нястомна, з зайздроснай лёгкасцю і упартасцю іграла «дзевятка» — Ганна Віснеўска. Многа вострых і прыгожых атак правялі ЯнінаНазельска, Ева Папроцка, Зоф'я Майгер і Гражына Расткоўска (трэнер каманды — Тадэўш Блашэк).

У добрай спартыўнай форме аказалася каманда баскетбалістак нашага універсітэта. Рэзультатыўна ігралі Т. Кабанава, З. Патапава, Л. Жабінская, Л. Карпікава, Л. Сняжкова і іншыя.

Калі да канца сустрэчы заставалася 22 секунды, а на табло упарта трымаліся лічбы 71:71, Л. Жабінская атрымлівае права кінуць два штрафныя мячы. Першы — промах, другі — ёсць! Лік становіцца 71:72.

Так з мінімальнай перавагай адказную сяброўскую сустрэчу, прысвечаную юбілею праўадыра, выйгралі беларускія спартсменкі.

**М. НЕЧЫПАРЭНКА.**

Фота аўтара.






**НА ЗДЫМКАХ:** польскія і беларускія баскетбалісткі са сваімі трэнерамі Тадэўшам Блашэкам і Рыгорам Міхайлавічам Грудо; (унізе) востры момант. У нападзенні Л. Карпікава, абараняецца Г. Віснеўска.

## ПОСПЕХ ПА ЗАСЛУГАХ

Пры рэспубліканскім Доме фізкультуры працуе секцыя цяжкай атлетыкі, дзе пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка БДУ В. Ф. Кавалёва і выкладчыка О. С. Саунiна трэніруюцца універсітэцкія штангісты.

Характэрна, што поспехі іх у спорце пераклікаюцца з поспехамі ў вучобе. Тыповы прыклад—Аляксандр Стаўраў. Чатыры гады назад яго захапіў спорт моцных, мужных. З таго часу і пачаліся упартыя і напружаныя трэніроўкі.

Цяпер Аляксандр вучыцца на IV курсе аддзялення радыёфізікі, дабіўся значных вынікаў у спорце; выступае ў сярэдняй вазе і мае I разрад, марыць аб кандыдацкім значку. Ён член зборнай БССР сярод юнакоў.

— Заняткі цяжкай атлетыкай, — гаворыць Аляксандр,—акрамя фізічных якасцей, развіваюць волю, дысцыплінаванасць. Каб прагрэсіраваць, трэба ўмець трымаць сябе ў руках, і— рэжым.

Заняткі спортам шмат даюць і для агульнага развіцця, пашыраюць кругагляд, бо ў час спаборніцтваў даводзіцца бываць у цікавых мясцінах, бачыць столькі новага!

На першым плане цяпер вучоба. Паспяхова закончыць БДУ— і ўсю ўвагу і сілы на ўдасканаленне ў спецыяльнасці. І, зразумела, штанга.

**В. ЯЦЭВІЧ,**
**студэнт журфака.**

# «ВІЦЯЗЬ» У ПЛАВАННІ

Летам гэтага года мы — Кавалеўская Раіса Зянонаўна, супрацоўнік лабараторыі эксперыментальнай біялогіі, і аўтар гэтых радкоў — удзельнічалі ў навукова-даследчай экспедыцыі ў паўночна-усходнюю частку Ціхага акіяна на судне «Віцязь». Гэта экспедыцыя была арганізавана Інстытутам акіяналогіі АН СССР. Некаторыя вытрымкі з экспедыцыйнага дзённіка раскажуць аб нашым жыцці, аб нашай рабоце.

Адкрыта кажучы, наш адыход асабліваға хвалявання не выклікаў. Відаць, усе даўно «перагарэлі» ў чаканні падарожжа. На беразе стаялі толькі дзве жанчыны...

**24 красавіка.**

— *Пойдзеш абедаць?*

— *А навошта?..*

На снеданне прыйшлі ўсе. Дзелавіта паеўшы, разышліся па сваіх лабараторыях, а затым то адзін, то другі, мяняючыся ў твары, пачалі выбягаць адтуль... Я вырашыў не выдзяляцца сярод вучоных людзей. Так, першы дзень—першыя гайданні.

У дванаццаць пайшоў і вырашыў хоць крыху перакусіць: усе бывалыя маракі раяць пры любых гайданнях і хваляваннях трымаць свой страўнік туга набітым. Гэта марскі закон. Нядрэнна таксама і паляжаць. Вельмі нядрэнна.

**26 красавіка.**

Прайшлі Сангарскі праліў і Японію. Гайдаць стала мацней — 6—7 балаў. Пад вечар — першая пробная станцыя. Тэмпература вады +3,2°С.

**27 красавіка.**

Сёння нядзеля, а яе тут і не адчуваецца.

Да гайданняў прызвык, а гэта значыць: можна працаваць, можна есці...

**30 красавіка.**

У гэту ноч ніхто не спаў. І не таму, што не хацелі, а проста нас «крыху» пагайдала. Па каютах і лабараторыях лятала ўсё. Дзень і ноч адны цыклоны. Адзін адыходзіць, другі даганяе, у трэцім мы сядзім і гайдаемся.

**1 мая**

Ноччу яшчэ на гадзіну адарваліся ад маскоўскага часу. У Маскве і Мінску цяпер 23.00 30 красавіка, а ў нас на «Віцязі» 8 гадзін раніцы 1 мая. Пад намі цяпер 6 тысяч 800 метраў. Гэта ўвогуле глыбока. «На вуліцы» тэмпература 1—2 градусы вышэй нуля. А ў нас, у роднай Беларусі, ужо больш 20.

«Віцязь» робіць 300 міль у суткі. Ідзем курсам на Аляску. Злева па борце Алеуцкія астравы — усяго 30 міль, але іх не відаць.

*«Нельга ступіць двойчы ў адну і тую ж раку...»*

Як ні дзіўна, але сёння для нас зноў 1 мая. Мы перайшлі 180°, а на гэтай палавіне Зямлі яшчэ свята. Давядзецца зноў адзначаць.

**2 мая.**

Кіно глядзім кожны дзень. Чакаем вучэбную трывогу, чакаем радыёграмы...

Вячэраць падалі азу з кітовага мяса. Калі есці няма чаго, то і гэта, вядома, добрая страва...

а крэслы не. І вось у час шторму то адзін то другі нясецца на сваім крэсле праз усю сталовую і з трэскам уразаецца ў другі стол... Але звычайна смяешся ўжо пасля таго, калі сам паабедаеш.

**3 мая.**

Амаль кожны дзень над намі кружаць амерыканскія самалёты. Яны фатаграфуюць нас, а мы іх.

**4 мая.**

Прама пад маёй каютай на палубе працуе лябёдка. Працуе вельмі «прыемна» і зусім «нячутна». Дома рабяты пішуць дыпломы, а мы тут клапоцімся аб калекцыі для нашага факультэта. Калі нам з трала нічога не даюць, то мы... Адным словам, навука патрабуе ахвяр, і калекцыю ўсё ж мы збяром.

*...Замацаваць усю пасуду і прыборы ў лабараторыях. Чакаецца моцны шторм...*

(З аб'явы па спікеру).

**6 мая.**

Ужываем страву вельмі смешна. Сталы замацаваны,

**8 мая.**

Сёння была вучэбная трывога. Раптам нешта заквакала і завыла, і ўсе пабеглі. Хто куды.

**10 мая.**

Работы завал. Здабыў двух глупышоў (Aves).

**15 мая.**

*...Усім сабрацца ў 18.00 у сталовай. Арганізуецца хор...*

(З аб'явы па спікеру).

Хацелі арганізаваць хор, але мужчыны забаставалі.

**19 мая.**

Працуем, як чэрці. Усе дні. Спім на хаду. Прастаяў вахту каля лябёдкі 30 гадзін запар, а потым яшчэ ставілі буй. Многа коцікаў. Ёсць кашалоты (калі гэта яны). Ловім марскую капусту і... ядзім.

Відаць востраў Шарлоты. Аляска. Зямля!!!

**20 мая.**

Астравы і горы. Прыгожа. Былая руская зямля. Эх, Аляска, Аляска!

**23 мая.**

Роўна месяц жывём без зямлі. Без яе пахаў. Хочацца ў лес. Хочацца кветак і зямнога дажджу.

**28 мая.**

Стаім у Канадзе. Ванкувер. Усё ў зелені, і, дзякуй богу, зямля пад нагамі! На «Віцязь» прыходзяць госці. У большасці гэта нейкае пакаленне былых эмігрантаў. Некаторыя гавораць па-руску.

...Марыя. Руская дзяўчына. Вучыцца тут, у Ванкуверскім універсітэце. Гаворыць па-руску з акцэнтам. Вельмі хоча ў Расію. Меркавала, што ў нас адзенне тыпу пінжакоў і кофт называюць кафтанамі. Упершыню пачула слова «басаножкі». Вельмі смяялася...

Вучыцца тут вельмі цяжка. За ўсё трэба плаціць. За 10 месяцаў вучобы — 800 долараў.

Гулялі з мясцовымі студэнтамі ў футбол. Лік—2:2.

**2 чэрвеня.**

Канада праляцела хутка. І вось мы зноў у дарозе. У меню з'явіліся арбузы, яблыкі, апельсіны, памідоры. Часнок і лімоны — кожны дзень.

**7 чэрвеня.**

Аддзяжурыў па караблю. Суткі. Вецер у 8 балаў.

**12 чэрвеня.**

З кожным днём усё бліжэй да роднага дома, да сяброў. Сёння роўна два месяцы, як мы выехалі з Мінска. Але наперадзе яшчэ—Японія.

**20 чэрвеня.**

Праскочылі праз 180°, і для нас 19 чэрвеня не было. Адразу за 18—20-е. А шкада, усё ж лішні дзянёк нядрэнна было б пражыць. Але нічога. Затое ў нас былі два першыя маі!

**24 чэрвеня.**

Цяжка на караблі са спортам. Бегаць нельга. Суцяшае крыху толькі маленькі тэніс ды гантэлі.

**3 ліпеня.**

Заўтра Японія. Асака. Заканчваецца рэйс. Вада — +25°. Вечарам лавіў лятучых рыб.

**6 ліпеня**

Японія ў дажджы і ў сонцы. Вельмі вільготнае паветра. Ходзім, аглядаем. Але хочацца дадому, на родную зямлю.

**10 ліпеня.**

Уладзівасток. Дом. Свае людзі. Свая мова. На беразе з кветкамі жанчыны. Цяпер іх многа. Усмешкі, пацалункі і зноў усмешкі...

А пасля самалёт. Праз усю Расію ляцім у Мінск, дадому, дзе мы не былі амаль чатыры месяцы...

**Ю. ГІГІНЯК,**
**асістэнт кафедры заалогіі беспазваночных.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 03429 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 2086. Тыраж 2000 экз.